ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 76 (1345) ПЯТНІЦА, 3-га красавіка 1931 г.

ДЭКРЭТ РАЗГОРНУТАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПУ

Узьнімем яшчэ вышэй хвалю колгаснага прыліву

Палажэньне аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку на 1931 год уяўляе сабою дакумант вялізарнейшай палітычнай важнасьці.

Побач з іншымі мерапрыемствамі партыі і ўраду, накіраванымі на стымуляваньне новага магутнага прыліву ў колгасы, дэкрэт аб с. г. падатку адыграе агромную палітычную ролю.

Сыстэма ільгот і пераваг (вызначэньне прыбыткаў па справаздачнасьці колгасаў, нормы абкладаньня, парадак спагнаньня і г. д.), што даюцца сёлета колгасам у параўнаньні з аднаасобнікамі, зьяўляецца магутным вагаром у барацьбе за суцэльную колектывізацыю і, на яе аснове, ліквідацыю кулацтва як клясы.

Нарэшце, дэкрэт аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку накіраваны на форсаваньне тэмпаў разьвіцьця высока-таварных, вядучых галін сельскай гаспадаркі, як жывёлагадоўля, тэхнічныя культуры (лён каноплі і г. д.) Жывёла ўсіх відаў у колгасах вызваляецца ад абкладаньня. У аднаасобных гаспадарках вызваляецца ад абкладаньня свінагадоўля і ўвесь прырост кароў, быкоў і авечак нагалоўя 1930 году.

Пасеў лёну і канапель абкладаецца па паніжаных нормах.

Таксама ўвесь прырост пасеўплошчы ў колгасах і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, усе ўзьнятыя залежы і цаліна вызваляюцца ад падатку.

Усе гэтыя ільготы даюць стымул для максымальнага пашырэньня пасеўплошчы ў 1931 годзе.

„Задача зараз у тым, каб усе гэтыя ільготы хутка давесьці да кожнага колгасьніка і аднаасобніка, каб як найшырэй, тэрмінова разгарнуць масавую працу па растлумачэньню сутнасьці новага дэкрэту“.

Трэба каб комсамольскія ячэйкі зараз-жа організавалі масавую прапрацоўку дэкрэту на комсамольскіх сходах моладзі, колгасьнікаў, беднякоў і серадьнякоў аднаасобнікаў.

Разгарнуць шырокую працу па выяўленьню ўсіх кулацкіх гаспадарак і абкладаньню іх у індывідуальным парадку, вядучы рашучую барацьбу з права-опортуністычнай практыкай і левымі антысераднiцкімі загібамі, з залічэньнем працоўных серадняцкіх гаспадарак у лік гаспадарак, якія абкладаюцца ў індывідуальным парадку.

Узьняць на вышэйшую ступень тэмпы падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны, разгарнуўшы шырокую працу па выкананьню пляну контрактацыі, організацыі новага масавага прыліву ў колгасы, пасіліць наступленьне на кулака, ліквідуючы яго як клясу на базе суцэльнай колектывізацыі.

Палажэньне аб адзіным с.-г. падатку на 1931 год

Агульнае палажэньне

Адзіным с.-г. падаткам абкладаюцца: колектыўныя гаспадаркі (с.-г комуны, с.-г. арцелі і таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі); неаграмаджаная частка гаспадарак колгасьнікаў; аднаасобныя сялянскія гаспадаркі. Зьмешаныя прамыслова-с.-г. арцелі (прамколгасы), якія ўваходзяць у саюзы прамысловай коопэрацыі, абкладаюцца па ўсіх сваіх прыбытках адзіным с.-г. падаткам, калі сельская гаспадарка ў іх аграмаджана ня меней, чым ва ўсіх колгасах, якія ўваходзяць у райколгассаюзы.

Прыбыткі, атрыманыя сялянскімі аднаасобнымі гаспадаркамі ад удзелу ў прасьцейшых аб'яднаньнях абкладаюцца па аднаасобных гаспадарках.

Абкладны год па адзіным с.-г. падатку лічыцца з 1 студзеня па 31 сьнежня ўключна.

Як абкладаюцца прыбыткі колгасу

Падатак з колгасаў вылічваецца ў наступных разьмерах: з с.-г. комун і арцеляй—3 капейкі з кожнага рубля агуловага прыбытку; з таварыства па супольнай апрацоўцы зямлі—4 капейкі з кожнага рубля агуловага прыбытку.

Поўнасьцю аслабаняюцца ад падатку ўсе колгасы, у якіх увесь агуловы прыбытак (бяз вылікаў, прадугледжаных у артыкуле 5-м) не перавышае 60 рублёў на едака.

Ільготы колгасам

Апрача таго, колгасам даюцца ільготы ў мэтах пашырэньня пасеўных плошчаў, у мэтах разьвіцьця жывёлагадоўлі і малочнай гаспадаркі, у мэтах разьвіцьця тэхнічных культур і спэцыяльных галін сельскай гаспадаркі, а таксама выканаўшым заданьне па пасеву, апрацоўцы і ўборцы і па адлічэньнях ад неземляробчых заработкаў колгасьнікаў ільготы даюцца і тым колгасам, у склад якіх уваходзяць ваеннаслужачыя, асобы, узнагароджаныя ордэнамі, героі працы, асобы, якія знаходзяцца на службе ў ваенізаванай ахове, міліцыі і крымінальным вышуку, а таксама пацярпеўшыя ад кулацкага гвалту і інш; а таксама і колгасам, якія перасяляюцца ў плянавым парадку на новыя месцы.

Падатак колгасамі выплачваецца 50 проц.—да 1 лістапада і 50 проц.—да 15 сьнежня 1931 году.

З неаграмаджанай часткі гаспадарак колгасьнікаў падатак вылічваецца па прыбытку ад наступных крыніц: а) ад паляводзтва; б) ад лугаводзтва; в) ад спэцыяльных галін сельскай гаспадаркі; г) ад неземляробчых заработкаў.

Прыбытак ад жывёлагадоўлі абкладаецца толькі ў гаспадарках, членаў тых таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі, у якіх не аграмаджана рабочая жывёла і інвэнтар.

Пры ўліку неземляробчых заработкаў колгасьніка выключаецца тая частка, якая адлічваецца ў сродкі колгасу.

Пры налічэньні падатку па неаграмаджаных прыбытках колгасьнікам: з першых 50 руб. прыбытку на гаспадарку бярэцца 4 кап. з кожнага рубля, адпаведна павышэньню прыбытку павялічваецца і сума падатку і, пры прыбытку звыш 700 рублёў, падатак з аднэй гаспадаркі бярэцца ў разьмеры 30 кап. з кожнага рубля.

Калгасьнікі карыстаюцца ўсімі ільготамі, устаноўленымі для аднаасобных гаспадарак і, апрача таго:

а) поўнасьцю аслабаняюцца ад падатку тыя колгасьнікі, якія ў 1930 годзе аслабаняліся ад падатку як маламоцныя аднаасобнікі.

б) поўнасьцю аслабаняецца ад абкладаньня ўся жывёла гаспадаркі членаў с.-г. комун, арцеляй і ўсіх таварыстваў на супольнай апрацоўцы зямлі, у якіх аграмаджана рабочая жывёла і інвэнтар;

в) гаспадаркі членаў с.-г. таварыстваў на супольнай апрацоўцы зямлі, рабочая жывёла і інвэнтар якіх не аграмаджаны, продукцыйная жывёла (каровы, авечкі, сьвіньні і козы) абкладаецца па нормах, зьніжаных у 2 разы супроць аднаасобных;

г) гаспадаркі членаў перасяленчых колгасаў аслабаняюцца ад падатку на тыя-ж тэрміны, якія устаноўлены для аслабаненьня саміх колгасаў.

Тэрмін выплаты падатку для колгасьнікаў устанаўляюцца на аднолькавых падставах з аднаасобнікамі.

Як абкладаюцца аднаасобныя працоўныя гаспадаркі

Падатак вылічваецца з кожнай паасобнай гаспадаркі па прыбытку ад наступных крыніц: а) ад паляводзтва; б) ад лугаводзтва; в) ад жывёлы ўсіх відаў, апрача сьвіней; г) ад агародніцтва; е) ад садаводзтва, вінаградніцтва і табакаводзтва; ж) ад неземляробчых заработкаў (заработнай платы, саматужных, рамесьніцкіх і іншых заработкаў).

Ільготы аднаасобным працоўным гаспадаркам

Ня прыцягваецца да абкладаньня адзіным с.-г. падаткам заработная плата:

а) с.-г. рабочых (апрача кваліфікаваных);

б) членаў раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў, а таксама рабочых і служачых устаноў, якія разьмешчаны ў сельскіх мясцовасьцях і ў мястэчках і якія знаходзяцца на агульна-дзяржаўным ці мясцовым бюджэце.

в) выбарных асоб камітэтаў сялянскай узаемадапамогі і адпаведных ім організацый, а таксама сельскіх першапачатковых коопэратываў;

г) пасялковых коопэрацыйных організатараў.

д) раённых, вучастковых і працуючых у колгасах, саўгасах і коопэрацыйных організацыях, аграномаў і заотэхнікаў, іх памочнікаў і кантрольасыстэнтаў;

е) лясьнічых і іх памочнікаў, лясьнікоў, аб'езчыкаў і лясных вартаўнікоў, рабочых і служачых райколгассаюзаў у сельскіх мясцовасьцях і мястэчках.

Апрача таго ня прыцягваецца да абкладаньня адзіным с.-г. падаткам:

1) Плата за работу па працоўнай павіннасьці

2) літаратурны заработак;

3) усе віды забесьпячэньня ваеннаслужачых рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, работнікаў страявога і адміністрацыйнага складу міліцыі, актыўнага і адміністрацыйнага складу крымінальнага вышуку;

4) пэнсіі, якія атрымліваюцца ад дзяржаўных устаноў;

5) прыбыткі старацеляў па здабычы золата і плятыны.

Пералічаныя ў гэтым артыкуле прыбыткі ў падлягаючых выпадках абкладаюцца прыбытковым падаткам згодна палажэньня аб прыбытковым падатку прыватных асоб.

Заўвага: Заработная плата, якая атрымліваецца за работу на выбарчых пасадах у сельскіх першапачатковых прамысловых коопэратывах, аслабаняецца ад абкладаньня адзіным с.-г. падаткам толькі ў тых выпадках, калі выбраныя асобы ня маюць у даным коопэратыве іншых прыбыткаў апрача заработнай платы па выбарчай пасадзе.

Прыбытак ад паляводзтва вызначаецца ў адных мясцовасьцях па пасеву г. зн. па таму, колькі ў гаспадарцы сапраўды засеяна зямлі, а ў іншых—па пахаці, г. зн. па таму колькі ў гаспадарцы ёсьць ворнай зямлі, ўсёроўна—засеяна яна, ці не.

Для гаспадарак, якія скарацілі пасеўную плошчу бяз грунтоўных прычын, прыбытак ад паляводзтва вылічаецца па пасеўнай плошчы мінулага году.

Пры вызначэньні прыбытку ад лугаводзтва ў мясцовасьцях з заложна-пераложнай сыстэмай паляводзтва вучоту падлягаюць толькі тыя мясцовасьці, якія заўсёды выкарыстоўваюцца гаспадаркай.

У іншых мясцовасьцях улічваюцца ўсе сенажаці, якія ёсьць у гаспадарцы,—заліўныя, незаліўныя, нізьменныя, сухадольныя і лясныя.

Пры вызначэньні прыбытку ад жывёлы ўлічваюцца: а) коні, валы, буйвалы, аслы, мулы і вярблюды ва ўзросьце старэй за 4 гады, б) быкі, ва ўзросьце старэй за 3 гады, в) каровы пасьля першага ацёлу і цецелі старэй за 3 гады, г) [illegible] і козы.

Узрост жывёлы вызначаецца на 1 мая 1931 году.

Аб неземляробчых заработках

Неземляробчыя заработкі ўлічваюцца за час з 1 студзеня па 31 сьнежня 1930 году.

Прыбытак аднаасобнай гаспадаркі ад продажу с.-г. продуктаў на прыватным рынку ўключаецца ў прыбытак гаспадаркі, які абкладаецца, калі продукты прадаваліся па цэнах, перавышаючых цэны дзяржаўных і коопэрацыйных загатоўчых організацый.

Пры вылічэньні падатку з агульнай сумы даходу гаспадаркі, які абкладаецца, вылічаецца 20 рублёў на кожнага едака. Астача абкладаецца: з першых 25 рублёў спаганяецца па 4 кап. з кожнага рубля, прычым адпаведна павышэньню прыбытковасьці гаспадаркі падатак павялічваецца і з лішку звыш 600 рублёў бярэцца 30 кап. з кожнага рубля.

Апрача таго ільготы аднаасобным працоўным гаспадаркам даюцца ў мэтах пашырэньня пасеўных плошчаў, у мэтах разьвіцьця тэхнічных культур, у мэтах разьвіцьця жывёлагадоўлі і малочнай жывёлы. Ільготы даюцца асобам, узнагароджаным ордэнамі героям працы, ваенна-служачым РСЧА (у тым ліку войск АДПУ і канвойных войск), інвалідам, асобам, якія знаходзяцца на службе ў ваенізаванай ахове, міліцыі, і крымінальным вышуку і інш. Ільготы вуглякопам, ільготы перасяленцам, ільготы гаспадаркам пацярпеўшых ад стыхійных няшчасьцяў.

Аб маламоцных гаспадарках

7. Маламоцныя гаспадаркі аслабаняюцца ад падатку поўнасьцю або часткова па пастановах сельскіх падатковых камісій.

Па с.-г. падатку даюцца ільготы насельніцтву паўночных акраін і некаторых іншых мясцовасьцяй Саюзу ССР, ільготы насельніцтву, надзеленаму зямлёй і жывёлай у парадку зямельнай рэформы і ліквідацыі непрацоўнага землякарыстаньня ва Узбэкскай і Туркмэнскай соцыялістычных савецкіх рэспубліках, Казакскай і Кіргіскай аўтономных савецкіх соцыялістычных рэспубліках. Ільготы пацярпеўшым ад кулацкага гвалту і рад іншых ільгот.

Падатак выплачваецца ў тэрміны—1 лістапада па 1 кастрычніка.

Як абкладаюцца кулацкія гаспадаркі

8) Усе кулацкія гаспадаркі абкладаюцца па іх сапраўднай прыбытковасьці ў індывідуальным парадку, а не па нормах, і адпаведна павышэньню прыбытковасьці гаспадаркі падатак павялічваецца.

Гаспадаркі, абкладзеныя с.-г. падаткам у індывідуальным парадку, выплачваюць падатак, які з іх прылічаецца поўнасьцю з 1 кастрычніка 1931 г.

Тыя з раскулачаных гаспадарак, у якіх няма скрытых прыбыткаў, маюць права абкладаецца адзіным с.-г. падаткам на агульных падставах з аднаасобнікамі працоўных гаспадарак, але ня маюць права на якія-небудзь ільготы.

Хто спаганяе падатак

9) На раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы (а ў належных выпадках—і на гарадзкія саветы) ускладаецца адказнасьць за правільны і сваячасовы ўлік абкладаных об'ектаў, неабходны пры с.-г. падатку, за перадачу акладных лістоў, за сваячасовае і поўнае спагнаньне падатку.

Усе ўстановы, організацыі і прадпрыемствы (дзяржаўныя, коопэрацыйныя і прыватныя) абавязаны прад'яўляць падатковым органам, райвыканкомам і сельсаветам па іх патрабаваньню весткі аб сумах, выплачаных плацельшчыкам адзінага сельгаспадатку. Пры гэтым яны павінны ўказваць імя, па бацьку і прозьвішча атрымальнікаў і месца пражываньня (вёска, раён), а таксама ўказаць, за што выплачана. Усе заявы і скаргі аднаасобнікаў і колгасьнікаў па с.-г. падатку падаюцца ў сельскія саветы, якія абавязаны неадкладна перадаць іх на разгляд сельскіх падатковых камісій.

Заявы і скаргі колгасаў па сельгаспадатку падаюцца ў райфа, які абавязан неадкладна перадаць іх на разгляд раённай падатковай камісіі.

Заявы і скаргі павінны быць разгледжаны не пазьней месячнага тэрміну з дня іх падачы.

Падача заяў і скаргаў не прыпыняе спагнаньня падатку.

За захаваньне крыніц прыбытку ад органаў спагнаньня падатку плацельшчыкі штрафуюцца ў адміністрацыйным парадку або прыцягваюцца да адказнасьці па суду.

Адказнасьць плацельшчыкаў

16. Да плацельшчыкаў, не заплаціўшых падатку ў тэрмін, ужываюцца меры, прадугледжаныя палажэньнем аб спагнаньні падаткаў. У прыватнасьці, маемасьць неплацельшчыкаў апісваецца і прадаецца, а за пратэрміноўку—спаганяецца пені.

Усе паступленьні адзінага с.-г. падатку звярачаюцца ў мясцовыя сродкі па сельскіх, раённых і гарадзкіх бюджэтах.

Непасрэдна ў сельскі бюджэт абарачаецца частка паступленьняў адзінага с.-г. падатку, устаноўленая заканадаўствам саюзных рэспублік, але ня менш 50 проц. усіх паступленьняў падатку на тэрыторыі данага сельсавету.

ЦК ЛКСМБ ухваліў ініцыятыву „Чырвонкі“

Пастанова сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 31—III-31 г.

Аб правядзеньні агляду-праверкі выкананьня рашэньняў IX УсеЛКСМ і X ЛКСМБ зьездаў, абвешчанага „Чырвонай Зьменай“

1. Ухваліць агляд праверку выкананьня рашэньняў IX—X зьездаў комсамолу, абвешчаны „Чырвонай Зьменай“ па менскай ор-цыі—у пытаньнях росту, віцебскай—паходу за тэхніку, койданаўскай—па ваенізацыі, лёзьненскай—ліквідацыі політ. няпісьменнасьці вясковага комсамолу.

2. Прапанаваць менскаму, віцебскаму ГК, койданаўскаму, лёзьненскаму ЛКСМБ прыняць практычныя заходы для мобілізацыі комсамольскай ор-цыі на дапамогу „Чырвонай Зьмене“ правесьці агляд выкананьня рашэньняў зьездаў па вызначаных пытаньнях.

3. Прапанаваць усім РК, на падставе праверкі 4-х організацый, правесьці масавую праверку выкананьня рашэньняў зьездаў, яшчэ больш мобілізаваўшы масы комсамольцаў, працоўнай моладзі на выкананьне задач партыі.

4. Лічыць мэтазгодным уключыць у групу раёнаў яшчэ адзін раён для праверкі выкананьня рашэньняў зьездаў на пытаньнях нац. культ. будаўніцтва.

Ад рэдакцыі: По нац. культ. будаўніцтву абвяшчаем агляд-праверку Горацкай організацыі.

Дэкрэт Гіндэнбурга ў дзеяньні

БЭРЛІН, 31.—Бэрлінская паліцыя пачала ўжо сёньня праводзіць у жыцьцё выданы ўчора Гіндэнбургам анты-комуністычны дэкрэт.

Сёньня днём бэрлінская арганізацыя „Саюзу рэволюцыйных вольнадумцаў“ склікала ў Порт-Паласе (самая вялікая заля Бэрліну) масавы антырэлігійны мітынг моладзі. У часе выступленьня акадэмічнага ляльнавага тэатру прысутныя на мітынгу паліцэйскія прарвалі прадстаўленьне, абвясьцілі мітынг распушчаным і прапанавалі прысутным 15.000 чал. у пяціхвілінны тэрмін ачысьціць залю. Гэты паліцэйскі гвалт выклікаў агромністае абурэньне сярод удзельнікаў мітынгу і толькі дзякуючы вялікай дысцыпліне ўдалося ўнікнуць сур'ёзных сутычак.

У весь буржуазны друк са задавальненьнем абгаварвае дэкрэт Гіндэнбурга і спадзяецца, што з яго дапамогай уладам удасца перашкодзіць росту рэволюцыйнага рабочага руху.

Канфіскаваны нумар комуністычнай газэты

БЭРЛІН. На падставе надзвычайнага дэкрэту канфіскаваны нумар комуністычнай газэты „Юд дэйчэ арбайтэр цэйтунг“. Повадам для канфіскацыі зьявілася адно месца ў артыкуле, накіраваным супроць царквы, у якім гаворыцца „каталіцкая царква ў мінулым была вінавайцам гібелі многіх мільёнаў невінных людзей“. Паліцыя ўгледзела ў гэтым артыкуле злосны паклёп на адну з рэлігій.

Роўным чынам, на падставе надзвычайнага дэкрэту, учора быў рэквізаваны плякат МОПР'у, у якім зьмяшчаўся заклік да збору ахвяраваньняў на карысьць МОПР'у.

Забаронены дэманстрацыі ў дзень моладзі

БЭРЛІН, 1.—Франкен, міністар унутраных спраў Браўншвэйга, нацыянал-сацыялісты (фашысты) па прыкладу бэрлінскага соцыял-дэмакратычнага паліцэй-прэзыдэнта Цэргібеля, забараніў, на падставе надзвычайнага закону Бруінінга-Гіндэнбурга, усе дэманстрацыі ў дзень моладзі. Міністар унутраных спраў Турынгіі, нацыянал-сацыяліст, забараніў дэманстрацыі і мітынгі ў Іене і Геры.

Ангельскія прамыслоўцы скарочваюць пэнсіі беспрацоўным

ЛЁНДАН, 1. Фэдэрацыя ангельскіх прамыслоўцаў апублікавала паведамленьне, у якім патрабуе скараціць на адну трэцюю частку пэнсію беспрацоўным, зарплату скараціць на 30 проц. усе дзяржаўныя выдаткі на соцыяльныя патрэбы.

У Бэрліне адбыўся парад „Сталёвага Шлему“

Компартыя наладзіла контрдэманстрацыю. Паліцыя спрабавала разагнаць гэту дэманстрацыю і ў выніку паміж паліцыяй і рабочымі адбыліся сур'ёзныя сутычкі.

На здымку: Паліцыя разганяе комуністычную дэманстрацыю.

Процэс над 58 сялянамі

ВЕНА. — З Софіі паведамляюць, што ў Татар-Базарджыку закончыўся процэс над 58-мю сялянамі вёскі Говэдары па абвінавачваньню ў арганізацыі паўстаньня. Падсудныя сяляне выступілі ў часе муніцыпальных выбараў у лютым мінулага году з протэстам супроць самачынных дзеяньняў старшыні мясцовай абшчыны, які зьнішчыў усе опозыцыйныя сьпісы. Для „уціхамірваньня“ ўзброеных сялян паліцыя пусьціла ў ход масавыя растрэлы і арышты. Многія арыштаваныя падпарадкаваліся самым моцным катаваньням і зьдзекам, аж да таго, што адзін з іх быў голы выкінуты на сьнег і потым спушчаны ў палонку на рацэ Марыцы. Процэс прыцягнуў к сябе ўвагу рэволюцыйнай грамадзкасьці ўсёй краіны, якая рэзка протэставала супроць падрыхтоўкі судовай расправы.

25 сялян прысуджаны да турэмнага зьняволеньня на тэрмін ад 1 7 год. Астатнія—апраўданы.

Вайсковая пропаганда для нападу на СССР

ВЕНА. — З Бухарэсту паведамляюць, што „Бесарабскае слова“ (контррэволюцыйны орган бесарабскай буржуазіі) публікуе матэр'ял аб узмацненьні ваеннай прапаганды сярод насельніцтва Румынскай Малдавіі і Бэсарабіі. Так, гэтымі днямі, камандзір першага чыгуначнага палка, у Ясах, па ваеннаму пытаньню выразіў заклік да падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

Арышты рабочых у Вэнгрыі

ВЕНА. — Па паведамленьнях з Будапэшту, па ўсёй Вэнгрыі працягваюцца арышты рабочых. 27-га лютага арыштавана яшчэ 11 рабочых, а 4-га сакавіка—4. Арыштаваныя зьверскі катуюць.

Новых 20.000 рабочых будуць выкінуты на вуліцу

ВАРШАВА, 1.—У сувязі са скарачэньнем заказаў, прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасьці Беластоку рашылі спыніць усе свае фабрыкі. Будуць выкінуты на вуліцы ня менш 20.000 рабочых.

РАСТУЦЬ КАЛЁНЫ ЎДАРНІКАЎ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

У адзнаку юбілею „Ч. З.“ ячэйка ўступіла ў колгас

У адзнаку 10-ці гадовага юбілею цэнтральнага органу комсамолу Беларусі—„Чырвонай Зьмены“, комсамольцы Самоцкай ячэйкі ЛКСМБ (Віцебскага раёну) цалкам уступілі ў колгас „Зьвязда“ і арганізавалі ў колгасе ўдарную комсамольскую камуну. Самоцкая ячэйка ўзяла на сябе абавязак шляхам соц. спаборніцтва і ўдарніцтва наладзіць зьдзельную аплату працы ў колгасе, змагацца за арганізацыю і вучот працы колгасьнікаў, паставіць на належную вышыню палітычна-выхаваўчую працу сярод колгасьнікаў.

Колгасьнікі разбіты на 13 брыгад, якія ахоплівацца ўсе галіны працы ў колгасе. Ачышчана поўнасьцю насеньне, адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Самоцкая ячэйка КСМ выклікае на соцспаборніцтва Калінскую ячэйку КСМ.

П. Гайдук.

Ударныя брыгады імя „Чырвонай Зьмены“

Комсамольская ячэйка ФЗВ машынабудаўнічага заводу імя Сталіна (Бабруйск) на пасяджэньні бюро распрацавала плян правядзеньня 10-га юбілею „Ч. З.“.

Бюро пастанавіла арганізаваць ударныя комсамольскія брыгады імя 10-й гадавіны „Чырвонай Зьмены“, і пашырыць тыраж „Чырвонай Зьмены“ з такім разьлікам, каб на кожнага комсамольца прыходзілася газэта. У выніку—замест былых 13 экз. на красавік месяц выпісана. 53.

Фрайман.

„Прыклад“ Вялікаборцаў

У Касьцюковіцкім раёне не вядзецца ніякай працы па падрыхтоўцы да 10-цігадовага юбілею „Ч. З.“ Прасоўваньнем „Ч. З.“ у гушчы моладзі ніхто не займаўся і ня дзіва, што некаторыя ячэйкі раёну зусім не ня выпісваюць. „Прыкладам“ можа быць Вялікаборская ячэйка комсамолу, якая ня мае ніводнага экзэмпляру „Чырвонай Зьмены“.

Пакуль ня позна. Касьцюковіцкі райком комсамолу павінен энэргічна ўзяцца за выкананьне ўмовы аб давядзеньні тыражу „Ч. З.“ да 60 тысяч.

ЛІСТ.

Аршанскі вучкомбінат ня ведае аб юбілеі

Да 10-цігадовага юбілею „Ч. З.“ комсамольская арганізацыя Аршанскага вучкомбінату ніякай падрыхтоўкі не вядзе.

Падпіска на „Чырвоную Зьмену“ малая. На ўсю комсамольскую арганізацыю выпісваецца 10 экзампляраў. Комсамольская арганізацыя ня ведае аб находзячым юбілеі.

М. А.

У змаганьні за падвышэньне тыражу

Камаровіцкая ячэйка ЛКСМБ (Пэтрыкаўскі раён) разгарнула падрыхтоўку да 10-га юбілею „Чырвонай Зьмены“. На бюро ячэйкі распрацован плян падрыхтоўчай працы, разгорнута работа па распаўсюджваньню „Ч. З.“ Кантрольныя лічбы на выпіску „Ч. З.“ ужо перавыконаны. Замест 16 экзэмпляраў, у якім маем ужо 35. Арганізавана брыгада юнкораў „Чырвонай Зьмены“.

Юнкор-ударнік „ЧЗ“ Пялінскі А. С. саўгас Камаровічы

Пост „Ч. З.“
А. Пялінскі

Ад вялікіх артыкулаў—да масавага матар'ялу

Аб тэй вялікай палітычнай ролі якую адыгрывае „Чырвоная Зьмена“ гаварыць ня прыходзіцца. Шэраг важнейшых пытаньняў да ліку, якіх належыць і такія як барацьба за мобілізацыю сродкаў, культэстафета, і іншыя знайшлі свой адбітак на старонках газэты. „Чырвоная Зьмена“ зьявілася організатарам соцыялістычнага канвэеру якасьці.

Нямала юнкораў выхавалася пры дапамозе „Чырвонкі“. Газэта ад вялікіх артыкулаў супрацоўнікаў перайшла да масавага юнкораўскага матар'ялу.

Разам з тым я хачу адзначыць і недахопы. Рэдка склікаюцца юнкораўскія брыгады, слаба асьвятляецца пытаньне грамадзкага харчаваньня.

Трэба адзначыць, што з боку некаторых комсамольскіх колектываў наглядаюцца нядбайныя адносіны да пытаньня распаўсюджваньня „ЧЗ“. Яя прыклад, возьмем комсамольскі колектыў заводу „Бальшавік“ які налічвае звыш 100 комсамольцаў, а „Чырвонку“ выпісьваюць адзінкі. Газэта павінна жорстка ўдарыць па тых, хто недаацэньвае ролі друку.

Мае прапановы—выпускаць старонкі, прысьвечаныя рабоце таго ці іншага комсамольскага колектыву па таму ці іншаму пытаньню. Друкаваць консультацыю, для юнкораўскіх брыгад юнкор-адзіночак. Друкаваць рэцэнзыі комсамольскіх старонак, якія маюцца ў шматтыражках фабрык і заводаў.

Мінкін З.

Забясьпечыць ФЗВ

Летась у Гомелі, пры заводзе „Рухавік Рэволюцыі“, была арганізавана школа ФЗВ. У школу былі набраны выхаванцы дзіцячых дамоў.

Дрэнная організацыя працы і дрэнныя бытавыя ўмовы надзвычай на балюча адбіваюцца на кваліфікацыі вучняў. Неабходна прыняць патрэбныя захады, каб лепш забясьпечыць ФЗВ.

А. Рахлін

Бунт штрафных

Ліст з Тулона

Францыя

28-га лютага ўжо к 7 гадзіне раніцы ў газэтчыкаў Тулона не засталося ніводнага № комуністычнай газэты „Юманітэ“. Увага рабочых была прыкавана к суду над 6 маракамі: Ірапам, Шалёякам, Бодо, Шарлёнам, Мосуа і Альбертам Нувьсі, абвінавачаных у невыкананьні загадаў і падбухторваньні к бунту.

Яшчэ напярэдадні тулонскія рабочыя правялі два мітынгі ў абарону асуджаных. Марці, Руцьяпаш і Кутэляс гнеўна абвінавачвалі з трыбуны буржуазны суд.

Чаму матросы пайшлі супроць начальства? Чаму яны адмовіліся падпарадкавацца? На гэта іх штурханулі нячуваныя зьдзекі і катаржныя ўмовы ва флёце імпэрыялістычнай Францыі.

Я блізкі да жыцьця матросаў. Вось некаторыя факты з быту штрафных каманд.

Пясок на абед

У штрафных камандах за праступкі часта мораць голадам. Правініўшыся атрымлівае страву раз у шэсьць дзён. У астатнія 5 дзён тыдню ён атрымлівае толькі кубак мутнае кавы раніцою, удзень і ўвечары крыху падазронай жыжкі і ніводнага грама хлеба.

Робяць і так. Пасьля пяцёх дзён мардаваньня голадам салдат чуе звон пасуды. Нарэшце, думае ён,—я ўгамую свой голад. І што-ж? Яму прыносяць поўную міску... пяску альбо солі.

Даведзеньня да адчаю „штрафныя“ часта канчаюць самагубствам. Ня аўна адзін з маладых салдат пісаў сваёй матцы: „Мой таварыш Трокнэ кавалкам жалеза разрэзаў сабе вену на руцэ. У карцэр, дзе знаходзіўся Трокнэ, зайшоў дзяжурны афіцэр. Трокнэ ляжаў у лужы крыві. Яго зараз-жа прывялі ў прытомнасьць, ён не памёр. На наступны дзень яму заявілі, што тэрмін яго арышту працягнуты на 30 дзён у пакараньне за замах на самагубства“.

Пацуковая нара. Мардаваньне смагай

Вынаходніцкі талент афіцэра-садыстага ў справе катаваньняў радавых нявычэрпны. Для асабліва балючага катаваньня яны адвялі спэцыяльнае памяшканьне, вядомае пад імем пацуковай нары.

Пацуковая нара—невялікае памяшканьне з наглуха забітымі вокнамі: блядое сьвятло пранікае толькі праз дзьве адтуліны, кожная шырынёю ў ў 10 сантымэтраў.

Раз у дзень жыхароў пацуковай нары выпускаюць на двор для заняткаў „швэдзкай гімнастыкай“, як гэтага патрабуе статут. Швэдзкая гімнастыка—чарговы зьдзек. „Фізкультурніка“ прымушаюць бегаць, трымаючы на выцягнутай руцэ пакет і 11 кілё вугалю.

Другі від катаваньня—катаваньне смагай. Штрафным даюць толькі чвэртку літра вады раніцою і столькі-ж увечары. Некалькі тыдняў таму назад салдаты зьберагалі крыху вады, прызначанай для ўмываньня. Яны хацелі гэтую ваду выпіць. Офіцэр гэта прыкмеціў і палажыў у ваду кавалак мыла.

„Чвэртка літра вады для вас зусім даволі,—заявіў ён у адказ на протэсты штрафных“.

7 месяцаў прасядзелі трое штрафных, Шалёяк і яго таварышы, у пацуковай нары—гэтым рассадніку сухотаў. Нарэшце, над імі зьлітаваліся і перавялі іх у форт Майльбуа. Але на другую раніцу прыбыўшых кінулі ў карцэр. Офіцэры Майльбуа ні ў чым ня ўступалі катам з Кальві. Яны пачалі густа саліць суп штрафных. Матросы ня вытрымалі і абвясьцілі галадоўку. Туды іх кінулі ў другі карцэр, настолькі вільготны, што іх адзежа наскрозь прамокла. Калі ўрач, пасьля настойлівых просьбаў зьняволеных прапанаваў каптэнармусу даць саламяныя мяхі, той заявіў: „ня дам, бо мяхі згніюць ад вільгаці“.

Бунт 18 кастрычніка

Абстаноўка напальвалася з кожным днём. Насьпяваў бунт. 18 кастрычніка офіцэр Легаль нанёс мацнейшы ўдар нагою матросу Лятоню. Увечары 19 кастрычніка начальства пачало пераграсаць куфэрчыкі салдат і рваць на часткі ўсе сямейныя фотографіі і здымкі, якія салдаты ўзялі з сабою з дому.

Гэта перапоўніла чашу цярпеньня.

На другую раніцу сярод сьцен штрафной каманды раздаліся гукі інтэрнацыяналу. Яго сьпявалі „13 бунтаўнікоў“. Яны забарыкадаваліся і тры гадзіны адбіваліся ад нападаўшых унтэр-офіцэраў. Нарэшце, іх схапілі і зноў кінулі ў камэру.

У той-жа дзень яны пачулі праз сьцены карцэру крыкі: „Ня бійце, ня бійце“. Гэта крычаў салдат Кінэр, якога зьбіваў офіцэр Рамонэ. „13 бунтаўнікоў“ рашылі дапамагчы таварышу. Яны пачалі ламаць дзьверы. Але яны адчыніліся самі. У карцэр увайшло 10 унтэр-офіцэраў з стрэльбамі на пераве с. „Бунтаўнікоў“ зьбілі да паўсьмерці. Пасьля гэтага іх перадалі ваеннаму суду.

Маракоў абаранялі французскія комуністыя—Андрэ Марці, Жак Садуль і Фурнэ. Марці падрабязна спыніўся на ўмовах жыцьця маракоў ва Францыі. Марці сказаў: „Мы на баку юных, храбрых маракоў, таму што яны рабочыя. Рабочая кляса патрабуе іх вызваленьня“,

Маракі і офіцэры

Маряк—гэта той-жа рабочы. А віцэ-адмірал Бра-адміністратар мэталюргічных прадпрыемстваў і верфяй. Віцэ-адмірал Ляказ, былы міністар, зьяўляецца кіраўніком „Кампаніі Фрэйсінэ“, замешанай у афэры „Устрык“. Адмірал Рацье супрацоўнічае ў чорнасоценнай газэце „Фігаро“. Віцэ-адмірал Швэрэр зьяўляецца адным з правадыроў самай чорнасоценнай газэты Францыі „Ляконон Франсэз“.

Соцыял-фашыстыя засталіся вернымі сабе. Яны па ўказаньню тулонскай ахранкі зьвярнуліся ў Ваенна-морскі штаб з просьбай уціхамірыць рабочы рух у абарону маракоў.

Адзін з мясцовых соцыял-фашысцкіх правадыроў, Жубэрт, клікаў бацько падсудных маракоў у суд, каб яны заявілі там „аб іх нязгодзе з кампаніяй, узьнятай пролетарскімі організацыямі“, аб тым, што „яны лічаць сваіх дзяцей—ахвярамі дрэнных парад комуністычных работнікаў“...

Аднак, з гэтага нічога ня вышла. Бацькі маракоў гэтага не зрабілі.

Пад уціскам рабочае клясы Францыі і пад уплывам адбыўшыхся ў Тулоне масавых мітынгаў і дэмонстрацый, морскі трыбунал прымушан быў вызваліць усіх арыштаваных маракоў.

П'ер Бутэ.

АДНААСОБНЫ СЭКТАР ДРЭННА РЫХТУЕЦЦА ДА СЯУБЫ

Перадавыя колгасы, вёскі, вазьмеце на грамадзкі буксір адстаючых!

Ворагу наносім руйнуючы ўдар

1930 год быў пераломным у колгасным будаўніцтве Капаткевіцкага р-ну. У 1930 г. раён быў колектывізаваны на 9 проц., цяпер мы вырасьлі на 6 проц. Кожны дзень праходзіць прыліў у колгасы.

Варожыя элемэнты вёскі вялі шалёную агітацыю супроць колгасаў. Кулацтва пускала чуткі, што хутка будзе вайна, што ў колгасы ісьці непатрэбна і што рака Пціч ужо адрэзана палякамі. Кулакі ўзьнімалі шалёны паклёп:

— Покуль у колгасе будзеш мець свае, будзеш жыць, пасьля-ж галадаць будзеш.

Бедната і серадняцтва цьвёрда стала на шлях колектывізацыі. Аб гэтым сьведчыць шырока-разгорнуты сталінскі заклік.

Комсамольская організацыя разгарнула шырокую работу па падрыхтоўцы правядзеньню другой бальшавіцкай вясны. У праўленьнях колгасаў 10 проц. комсамольцаў у той час, як у мінулым годзе ніводнага комсамольца ў праўленьнях ня было.

Праведзены конфэрэнцыі беспартыйнай бядняцка-серадняцкай моладзі, прысьвечаныя падрыхтоўкі да сяўбы. На конфэрэнцыях шырока былі абгавораны і прапрацаваны плян сяўбы. Праведзены кутавыя нарады па гэтым пытаньні.

У гэтым годзе мы пашыраем вясеньні клін на 38 проц.

Наш раён пераважна жывёлагадоўчы. Грэчка і проса больш ня будзем сеяць. Мы пашыраем больш рэнтабельныя культуры (лубін, сэрадэля, сілосныя культуры). Сілосаваньне палкам сябе апраўдала.

Амаль усе колгасы забясьпечаны кармамі. Колгас „Чырвоны Кастрычнік" яшчэ месяц таму назад ня меў ніводнага каліва сена. Гэты колгас цяпер забясьпечаны кармамі.

Усе колгасы адрамантавалі інвэнтар. Гэта мы дамагаліся шляхам прымацаваньня колгаса, ня маючых кузьняў, да тых, якія іх маюць.

Усюль прапрацаваны вытворчыя пляны. Праведзены курсы жанчын-грамадчыц, якія ахапілі 50 чалавек. Цяпер праводзяцца курсы па організацыі працы.

У раёне 34 колгасы. Увесь раён, дзякуючы бязьлітаснай барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, дзякуючы энтузіязму комсамольскай організацыі, ва ўсеўзброяньні сустракае другую бальшавіцкую.

Герасімовіч,

Узяць на буксір аднаасобны сэктар

ЛЁЗНА.—Па індывідуальным сэктары яшчэ не забясьпечана поўнае выкананьне пляну падрыхтоўкі да сяўбы. Тэмпы колектывізацыі па раёне нездавальняючыя. Колектывізавана толькі 20 проц. гаспадарак. Страхавыя насенныя фонды па аднаасобным сэктары сабраны на 13,6 проц. Плян па ачыстцы выкананы на 18 проц. Плян збору попелу выкананы толькі на 5 пр.

Абвешчаны ЦК ЛКСМБ месячнік баявой пасеўнай трывогі не ператварыўся ў сапраўдную трывогу для раённых організацый, яны ня б'юць трывогі на мясцох. Лёзьненшчына—прамыслова-ільнаводны раён. На шляху да спэцыялізацыі, у выкананьні пляну сяўбы і кантрактацыі' яна мае прарывы. Аб гэтым ня раз пісала „Чырвоная Зьмена".

Трэба ўключыць аднаасобны сэктар у пасеўную трывогу комсамолу, каб па-бальшавіцку падрыхтаваць аднаасобнікаў да сяўбы.

Гузоўскі М.

У поле выедзем падрыхтаванымі

Лепельскі раён колектывізаваны на 45 проц. Каменскі с-с—68 проц. У колгасе „Чырвоны Сьцяг" 150 гаспадарак. Наша ячэйка ў апошні час вырасла да 20 чалавек.

Наш колгас ільнаводна-жывёлагадоўчы. Паводле пляну сёлета мы павінны засеяць 90 га ільну. Праўленьне колгасу з восені ўсё ільна-насеньне здало дзяржаве. Цяпер-жа мы маем насеньня толькі 120 пудоў, а трэба 500 пудоў. Не стае таксама і канапель 36 пудоў. Праўленьне колгасу павінна ў тэрміновым парадку вышукаць патрэбную колькасьць насеньня, у інакшым выпадку мы ня зможам выканаць наш плян.

Інвэнтар адрамантаваны. У пачатку красавіка колгас наладжвае пробны выхад у поле.

У гэтым годзе мы павінны пабудаваць сьвінарнік на 250 галоў. Лес ёсьць, праўленьне колгасу павінна паклапаціцца аб тым, каб у тэрміновым парадку адшукаць дошак для пабудовы сьвінарніку.

Кожны комсамолец зьяўляецца брыгадзірам. Ячэйка абвясьціла бязьлітасную барацьбу прагулам.

Калуцкі.

Падкулачнікаў—прэч з дарогі да пасеўнай

Расона

У Гарбачэўскім сельсавеце давядзеньне пляну сяўбы да двара на Заблудаўскім пункце кулакі-заможнікі сустрэлі ў штыкі. Падкулачніца, член сельсавету Грыгор'ева Натальля, сумесна з іншымі такімі-ж, заклікалі пакінуць сход і адмовіцца прыняць пасеўны плян. Плян быў сарваны.

Організуючы колгасьнікаў і беднату, трэба моцна ўдарыць па гэтых кулацкіх вылазках і выкінуць з складу сельсавету Грыгор'еву Н., пад кіраўніцтвам якой ў вёсцы Заблудове заўсёды зрываецца правядзеньне політычна-гаспадарчых кампаній.

БАТРАК.

Чарапашыя тэмпы

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы ў Сар'янскім сельсавеце (Дрысенскі раён) праходзіць вельмі маруднымі тэмпамі. Пасеўплян даведзен толькі да 5-ці пунктаў. Да паасобных гаспадарак пляна яшчэ не даведзены. Ячэйкі КП(б) і сельсавет працуюць чарапашымі тэмпамі.

Трэба адкінуць такі опортуністычны самацёк у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

СВОЙ.



За рамонтам інвэнтару

Зьняць ганаровае званьне шэфа

Менскі політэхнікум сувязі ўзяў шэфства над колгасам і абавязаўся дапамагчы яму ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны. Але... пастанова засталася пастановай. Ніякай шэфскай работы і практычнай дапамогі не праводзіцца.

Р. М-к



Ударнай падрыхтоўкай да сяўбы забясьпечылі колгасны прыліў

Партыйна-комсамольскія ячэйкі мястэчка Любань ударна рыхтуюцца да вясеньняй пасеўкампаніі. Яны наладзілі сыстэматычную працу з батрацтвам і беднатой, растлумачвалі задачы вясеньняй пасеўкампаніі і тэзісы тав. Якаўлева.

У выніку гэтай працы ў мястэчку організаваўся колгас „Ударнік" з 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Колгас „Ударнік" пачаў ужо падрыхтоўку да вясеньняй пасеўкампаніі.

Кох.

2-ая БАЛЬШАВІЦКАЯ

Сёньня сонца палае ярчэй,
Сёньня ранак пахучы і сьвежы
І лапоча паводкай ручэй,
Размываючы старыя межы.

І чарнеюць на ўзгорках палі,
І вазёры пад сонцам крышталяць.
Млосным водырам тлустай зямлі
Упіваюцца сонныя далі.

А ў колгасах ад раньняй зары
На шырокіх загонах шматполкі
Бязупынна гудуць трактары
І трашчаць цэлы дзень сартыроўкі.

Так з колёнамі новых машын
З колектыўнаю працай жаданай,
Мы прышлі на спатканьне вясны
Бальшавіцкай другой, ударнай.

І ў колгасных палёх красавік
Падружыўся з вясной маладзіцай.
Скора ў цвецені новай палі
Зарунеюць зялёнай пшаніцай,
Пад ударныя песьні машын,
Разам з раньняй вясновай паводкай,
За сяўбу бальшавіцкай вясны—
У рашаючы год пяцігодкі.

Я. ВАСІЛЕЎСКІ

„Жывога ў магілу загоняць гэтыя пасеўныя"

В-Сьлікаўскі сельсавет, Слуцкага раёну нездавальняюча рыхтуецца да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Па думцы старшыні сельсавету, тав. Акімчыка, няма нічога цяжэйшага і маруднейшага, як падрыхтоўка да сяўбы.

Ён ня хоча зразумець таго, што вясеньняя пасеўкампанія зьяўляецца баявой і адказнай задачай, што сельсаветы павінны стаць на чале гэтай работы.

Ён па-опортуністычнаму енчыць, што „пасеўныя ў магілу загоняць жывога чалавека". Гэта пацьвярджае праверка якая была утворана нашай брыгадай. Да большасьці вёсак і кулацкіх двароў пляны пасеўкампаніі не даведзены. Калі мы запыталі у старшыні сельсавету—колькі трэба чысьціць насеньня дык ён зьдзівіўся:

— „У лічбах? Ого! Гэта ня лёгкая справа. Тав. Тагіль (сэкратар сельсавету), ты падчас ня ведаеш, колькі ўсяго па сельсавеце трэба ачысьціць насеньня?.

— „Усяго? Ня ведаю",—адказвае сэкратар.

Колькі мы ні стараліся, усё-ж не маглі даведацца.

Брыгада накіравалася ў СКТУ. Але там з падрыхтоўкай да сяўбы ня лепш. Старшыня ня ведае, колькі трэба насеньня, каб забясьпечыць беднату.

З 35 цэнтнэраў насеннага фонду для сяўбы сабрана толькі 1,6 цэнтнэраў.

Па сталінскаму закліку, як кажа старшыня,—„вялікія дасягненьні". Праца ідзе на ўсе 100. Працуем па-ўдарнаму. Было два колгасы, а цяпер... тры. Прыліў таксама ёсьць. Гэтымі днямі падалі ў калгасы... дзьве заявы аб уступленьні".

Вось якія паказчыкі ў працы сельсавету па колектывізацыі. Сельсавет ня прыняў ніякіх захадаў, каб мобілізаваць масы працоўнага сялянства на выкананьне тых задач, без якіх немагчыма выйсьці ў поле, не абгаварыўшы пытаньня аб сталінскім закліку. Правая практыка і самацёк у працы—вось спадарожнікі работы сельсавету.

Брыгада „Ч. З. Прыбытак Самусевіч

Выгнаць з сельсавету кулацкага агента

РАГАЧОЎ. Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай сяўбы ў Збароўскім сельсавеце праваліваецца. Ні ў адной вёсцы пасеўпляны да двара не даведзены. Засыпка насенных страхавых фондаў, рамонт сельскагаспадарчага інвэнтара да гэтага часу не пачаты. Цьвёрдыя заданьні па засеву не даведзены да кулацка-заможных гаспадарак. Старшыня сельсавету кажа так: „Навошта даваць цьвёрдыя заданьні кулаку ці заможніку, гэтым я толькі нажыву сабе ворагаў". Гэты кулацкі агент бярэ пад свой уплыў нават некаторых іншых сяброў сельсавету.

Партыйна-комсамольскія ячэйкі не даюць рашучага адпору кулацкім агентам.

Райком партыі і КСМ ня прымаюць мер.

Т. Цалко.

Забясьпечыць прыліў у колгасы

У Мусіцкім сельсавеце (Грэскі раён) падрыхтоўка да сяўбы праходзіць нездавальняюча. Аб гэтым гавораць яскравыя факты. Ачыстка насеньня ў аднаасобным сэктары амаль не распачата. Сельсавет яшчэ не давёў пляны вясеньняй сяўбы да вёсак і паасобных двароў. Колгасьнікі не наладзілі належнай сувязі з аднаасобнікамі, не вядуць масавай работы па колектывізацыі. Адсюль—у колгасы няма масавага прыліву.

Час не чакае. Трэба па-ударнаму, па-баявому ўзмацніць падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы, увязаўшы яе з правядзеньнем колектывізацыі і організацыі прыліву ў колгасы.

Я. Дымаў

Скарыстайце вопыт азяранцаў

ТУРАЎ. На фронце падрыхтоўкі да сяўбы ў Азяранскім сельсавеце былі вялікія прарывы. Сельсавет па-бальшавіцку здолеў мобілізавацца для ліквідацыі гэтых прарываў, організоўваліся і пасылаліся ў адстаючыя колгасы і вёскі штурмавыя брыгады. Амаль па ўсіх вёсках праведзены выязныя пасе-джаньні прэзыдыуму сельсавету.

Гэта мерапрыемства ўзьняло актыўнасьць колгасьнікаў, а таксама беднякоў і серадлякоў аднаасобнікаў. Зараз наглядаецца прыліў у колгасы. Прарывы на пасеўфронце па-бальшавіцку ліквідуюцца.

Брыгада „Чырвонай Зьмены" Сухоцк, Канюшка і Багай.

Замест конкрэтнай працы—гаварыльня і пастановы

Дзякуючы дрэннай працы комсамольскай ячэйкі і профкому, Рагачоўскі пэдтэхнікум не паслаў ніводнай брыгады ў свой падшэфны сельсавет, каб конкрэтна дапамагчы колгасу ў правядзеньні вясеньняй пасеўкампаніі.

Профком некалькі раз ставіў гэта пытаньне на сваіх паседжаньнях, але выносіліся толькі прыгожыя пастановы. Конкрэтнай працы ня відаць. Настаўнік па сельскай гаспадарцы Валуеў свае лекцыі ня зьвязвае з сучаснасьцю, з падрыхтоўкай да вясновай сяўбы.

Трэба рашуча ўдарыць па бязьдзейнасьці Пэдтэхнікуму. Зараз-жа трэба організаваць брыгады для дапамогі колгасам і падшэфнаму сельсавету ў пасьпяховым правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

Т. Цалко.

Сыгналы „Ч. З." пачуты

БАРЫСАЎ, 30. (Па тэлефону ад нашага юнкора).—„Чырвоная Зьмена" сыгналізавала аб прарывах у падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі. Зараз Барысаўскі РК КСМ мобілізаваў 25 чал. для пасылкі на вёску. Частка з іх выехала ў сельсавет.

5 красавіка адбудуцца кустовыя сходы вясковай організацыі па пытаньню аб сыгналах „Ч. З." і месячніку баявой трывогі. **Кугель**

Барацьба з рэлігіяй—барацьба за соцыялізм

Комсамолія, мацуй антырэлігійны фронт!

Кожны комсамолец павінен быць ударнікам у барацьбе з рэлігіяй

РАЗГОРТВАЙЦЕ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ

(З ліста ЦК ЛКСМБ усім гаркомам і райкомам ЛКСМБ)

Надаючы вялікую важнасьць правядзеньню надыходзячай антывялікоднай кампаніі, якая будзе праходзіць у пэрыод найбольш абвостранай клясавай барацьбы і асабліва барацьбы за моладзь, ЦК ЛКСМБ прапануе ўсім РК, колектывам і ячэйкам, правесьці даклады, лекцыі і гутаркі на фабрыках, заводах, у саўгасах, колгасах, клюбах, хатах-чытальнях і г. д. на тэму „Паходжаньне хрысьціянства, ці быў Хрыстос, клясавая сутнасьць вялікадню, паходжаньне жыцьця на зямлі, рэлігія, як сродак барацьбы за моладзь". Лектарамі скарыстаць партыйныя, комсамольскія, піонэрскія, навуковыя, настаўніцкія, агрономічныя сілы, загадзя добра падрыхтаваўшы іх да гэтай работы.

Напярэдадні вялікадню шырока практыкаваць масавыя вечары і карнавалы працоўнай моладзі, усебакова скарыстаўшы ў правядзеньні гэтай кампаніі насьценныя і рачныя газэты.

Пры правядзеньні антывялікоднай кампаніі комсамольская організацыя павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на шырокае разгортваньне працы сярод дзятвары працоўнага насельніцтва, уцягваючы апошнюю ў правядзеньне кампаніі сярод дарослых, максымальна ўцягнуўшы піонэрорганізацыю для агітацыі і пропаганды сярод бацькоў.

У дні вялікадню комсамольская організацыя павінна організаваць выезд ў поле, наладзіць суботнікі, нядзельнікі па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара і па выкананьню іншых работ, максымальна ўцягнуўшы працоўную моладзь і ўсё дарослае працоўнае насельніцтва ў гэтую работу.

Усе агітмасавыя мерапрыемствы па антывялікоднай кампаніі павінны забясьпечыць новы ўздым творчага энтузіязму працоўнай моладзі на пасьпяховае выкананьне пастаноў партыі і комсамолу, поўнасьцю выканаць пляны другой бальшавіцкай вясны, забясьпечыўшы пасьпяховы і систэматычны прыліў ў колгасы аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак праз організацыю ўдарных комсамольскіх і піонэрскіх бязбожніцкіх брыгад і ініцыятыўных груп і яшчэ больш заўзята павесьці працу па ўзмацненьню абароназдольнасьці СССР.

Рыхтуюцца да антывялікоднай кампаніі

Наш адказ

Заслухаўшы даклад аб паходжаньні вялікадню, агульны сход вучняў Коханаўскай школы колгаснае моладзі лічыць, што правядзеньне вялікадню грае на руку клясавага ворага, распаўсюджвае нацыянальную варожасьць паміж працоўнымі і сам вялікдзень ёсьць зброя клясавага ворага ў яго супраціўленьні разгорнутаму соцыялістычнаму наступу па ўсім фронце.

Таму агульны сход ухваляе:

У вялікодныя дні абавязваемся не зрабіць ніводнага прагулу. У адказ вялікадню абвяшчаем сябе ўдарнікамі па правядзеньню другой бальшавіцкай вясны.

Далучаемся да запатрабаваньняў працоўных зачыніць царкву і сынагогу ў мястэчку і перадаць іх культустановам.

Правесьці сходы ў падшэфных колгасах, выкрываючы контр-рэволюцыйную шкоднасьць рэлігіі.

У час вялікадню выходзім на суботнік, сродкі ад якога аддамо на карысьць соцыялістычнага будаўніцтва.

К вялікадню выдаем спэцыяльны нумар насьценгазэты.

У падшэфных колгасах наладжваем антырэлігійныя вечары.

Усю антырэлігійную работу абавязваемся праводзіць пад знакам соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Прэзыдыум сходу.

Стаўка сэктантаў павінна быць біта!

У вёсцы Цалевіч, (Слуцкі раён) надзвычайна дрэнна пастаўлена культасьветная работа. Сельсавет, партыйная і комсамольская ячэйкі бязьдзейнічаюць у гэтай галіне.

За ўвесь зімовы час ячэйка ЛКСМБ правяла толькі адзін сход на якім былі абраны культармейцы, але далей гэтага праца не пайшла.

А ў гэты самы час у нашай вёсцы разгортваюць сваю дзейнасьць сэктанты.

У вольны час моладзь ходзіць на сходы сэктантаў, слухае розныя рэлігійныя сьпевы і бязглуздыя байкі. Сэктанства з кожным днём шырыцца, ня толькі ў вёсцы Цалевіч, але з суседніх вёсак прыяжджаюць сюды на сэктанскія сходы.

Клясавы вораг бязьлітасна змагаецца за моладзь, імкнецца ахапіць яе сваім клясавым варожым уплывам і аб'яднаць у шэрагах сэктанцтва.

Комсамольская ячэйка і райком ЛКСМБ павінны максымум ўвагі аддаць разгортваньню культмасавай работы ў вёсцы Цалевіч.

Шыла.

Барацьбу з рэлігіяй—у парадак дня

Ніякай падрыхтоўчай работы да антывялікоднай кампаніі ў Чачэрску не праводзіцца.

Комсамольская яўрэйская ячэйка ЛКСМБ і са атужныя організацыі зусім не займаліся пытаньнем барацьбы з рэлігіяй. Большасьць комсамольцаў ніякай растлумачальнай работы аб сутнасьці вялікадню не праводзіла сярод насельніцтва і сярод сваіх бацькоў.

Так далей не павінна быць. Трэба неадкладна разгарнуць работу саюзу ваяўнічых бязбожнікаў. У парадак дня работы комсамольскіх ячэек Чачэрску павінна стаць пытаньне антырэлігійнай работы.

Язэп Зільбэрт.

Вырашыць пытаньне

Яшчэ ў 1928 годзе рабочыя і працоўныя Барысаўшчыны патрабавалі перадаць яўрэйскую сынагогу пад памяшканьне першай школы, якая мае ў гэтым вялізарную патрэбу. Ні клюбу, ні габінэту, ні спортыўнай залі ў школе няма. На заняткі фызвыху прыходзіцца бегаць у другую школу, за паўкілёмэтра. Зразумела, што гэта тармозіць працу школы. Памяшканьне-ж яўрэйскай сынагогі пустуе.

Пад напорам працоўных мас, Барысаўскі гарсавет ухваліў перадаць сынагогу пад школу

Ужо два з паловаю гады справа марынуецца. Мы патрабуем як найхутчэй разгледзець пытаньне аб перадачы сынагогі пад першую школу.

А. Горфінкель.

Вялікадня ня будзем сьвяткаваць

У Жыткавіцкім клюбе будаўнікоў адбыўся вялікі вечар, прысьвечаны барацьбе з рэлігіяй. Замест правядзеньня вялікадню, удзельнікі сходу ўхвалілі падпісацца на акцыі Трактарацэнтру.

Адна колгасьніца ўнесла тры руб. на акцыі і выклікала іншых пасьледваць яе прыкладу.

Тут-жа на сходзе была сабрана больш 100 рублёў.

Шклявэр В. і Шафэр Н.

Разбураны гурток

Праца бязбожнага гуртка Бялыніцкай сямігодкі пастаўлена надзвычайна дрэнна. За ўвесь навучальны год заняткі былі толькі два разы. Настаўніца Пярэска, кіраўнік гуртка зусім не працуе. Аднойчы, калі вучні на школьнай радзе пачалі крытыкаваць Пярэску за яе работу, яна адказала, што гурток трэба распусьціць.

Школьная рада павінна ўзьдзейнічаць на тых, хто недаацэньвае важнасьці антырэлігійнай работы. Комсамольская ячэйка павінна разгарнуць бязбожніцкую работу ў школе.

Г. Іофэ

20 сакавіка ў Маскве ў ЦДЧА адкрыўся другі пленум Цэнтральнага савету бязбожнікаў СССР.

На здымку далегаты пленуму—піонэры 36 атраду СОНО на пленуме.

Гіганты ўключыліся

Да 5-га красавіка адгрузка будзе скончана

ХАРКАЎ, 29 (Ад нашага спэцкора. Спазьнілася дастаўкай). Усьлед за заводам „Змычка" у ліквідацыю прарываў па адгрузцы сельгасмашын для БССР уключыліся буйнейшыя заводы Украіны: „Серп і Молат" і „Комунар". 26-га сакавіка завод „Серп і Молат„ (гор. Харкаў) адгрузіў па нарадам 380 і 383—3100 зуб'яў для конных барон. Сёньня ўвечары ішла адгрузка апошніх партый зуб'яў. Гэтымі днямі завод пачынае грузіць 1000 дыскавых барон № 4. Заводакіраўніцтва абавязваецца скончыць адгрузку да 5-га красавіка.

Завод „Комунар" (Запарожжа) павінен быў адгрузіць за люты—сакавік 400 сенакасілак, а адгрузіў па 15-III-31 г. 205.

З прыездам брыгады ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены" адгрузка значна пасунулася уперад.

З 15 па 20-е пагружана яшчэ 60 сенакасілак.

Комсамольскі камітэт і кіраўніцтва заводу ўзялі на сябе абавязак скончыць адгрузку астатніх 135 сенакасілак к 5 красавіка.

„Лёгкай кавалерыі" сенакасілачнага цэху даручана прасачыць за адгрузкай.

Х. Б.

НАРОДЖАНЫ КОМСАМОЛАМ

(на ўрачыстым адчыненьні цэнтральнага яўТРАМу)

31 сакавіка у клюбе Харчавікоў адбылося ўрачыстае адчыненьне яўрэйскага ТРАМу і разам з гэтым першы грамадзкі прагляд яго першай пастаноўкі.

Адчыняючы ўрачыстае пасяджэньне ад імя менгаркому ЛКСМБ, тав. Фрумкіна адзначыла тую вялікую ролю, якую мае для нас пролетарская культура, пролетарскае мастацтва і яе конкрэтны выразьнік—яўТРАМ, як мастацкі агітпроп комсамолу.

Тав. Дубравіцкі, у сваім прывітаньні ад імя газэты „Юнгер Арбэйтэр", указаў на вялікую падтрымку і ўвагу комсамолу, газэты „Чырвонай Зьмены" і галоўным чынам, „Юнгэр Арбэйтэр", праяўленую да яўТРАМ'у.

Прадстаўнік ад Гомельскага яўТРАМ'у, вітаючы Менскі ТРАМ, расказаў аб працы гомельчан.

Таварышы з Наркамасьветы ЦСПСБ і інш. організацый адзначылі вялікую перамогу комсамолу на фронце пролетарскага мастацтва.

Ад Цэнтральнага камітэту ЛКСМБ і газэты „Чырвоная Зьмена" вітаў яўТРАМў тав. Платаў. Ён папярэджвае, што на першых кроках работы яўТРАМ'у мы можам чакаць некаторыя недахопы. Але мы ўпэўнены, што пры актыўным падтрыманьні ўсёй пролетарскай грамадзкасьці яўТРАМ выйдзе на перадавыя позыцыі культурнай рэволюцыі.

Ад імя старэйшага сабрата, БелТРАМ'у, вітаў яўрэйскі ТРАМ тав. Стэльмах.

— ТРАМ'ы,—гаворыць ён,—гэта не выпадковасьць. ТРАМ радзіўся і выхаваўся у клясавых бойках з нац. дэмаўшчынай, з ідэалізацыяй шляхэцкіх герояў Каліноўскіх, у бойцы за пролетарскае мастацтва.

— Наркамасьветы, прадстаўнік якога вось тут сядзіць, для опэры асыгнаваў 70.000 руб, а для нашага пролетарскага БелТРАМ'у ахвяраваў толькі 13.000, а для яўТРАМ'у—4.000 руб.

Гаспадарчыя і профсаюзныя організацыі павінны ўсебакова дапамагчы ТРАМ'у у разгортваньню яго баявой работы. Абяцанкі не дапамагаюць нашай барацьбе, патрэбна практычная дапамога.

Зачытваюцца шматлікія прывітальныя тэлеграмы розных організацый і асобных пролетарскіх артыстых. З адказным словам выступіў загадчык яўТРАМ'у, Лебедзеў які падрабязна расказаў, як нарадзіўся і працуе яўТРАМ.

Урачыстасьць скончана... Узьнімаецца заслона. Ідзе першая пастаноўка яўТРАМ'у „Франты". Аб ёй у бліжэйшых №№ „ЧЗ". А. У.

Загадчык ЯЎТРАМ'у—т. Лебедзеў

Папраўкі

З прычыны неахайнага перакладу і і прагляду рэдактуры і карэктуры, у друк трапіла політычна скажоная формулёўка. У адозьве Выканкому КІМ, зьмешчанай ў № 75 „ЧЗ" ад 2-га красавіка надрукавана: „Цясьней згуртуйцеся вакол вашай выпрабаванай у баёх бальшавіцкай партыі, вакол комсамолу, які кіруе ею". Трэба чытаць; „Цясьней згуртуйцеся вакол вашай выпрабаванай у баёх бальшавіцкай партыі, вакол кіруемага ёю комсамолу".

У № „ЧЗ" ад 31-га сакавіка на першай старонцы ў заметцы аб становішчы росту організацыі, у другім абзацы, пасьля слоў "ячэек па росту" замест „заводу „Бальшавік", памылкова надрукавана: колектыў заводу імя „Варашылава"

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599